Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа № 16 г. Ліды імя П.М. Машэрава”

# ВЫКАРЫСТАННЕ КРОСЭНСА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў VII КЛАСЕ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МЕТАПРАДМЕТНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У ВУЧНЯЎ

Хрышчановіч А.П., настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай адукацыйнай катэгорыі

Ліда

2024

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА 3
ЯКУБ КОЛАС. “У ЯГО БЫЎ СВЕТ ЦІКАВЫ…” (УРЫВАК З ПАЭМЫ “СЫМОН-МУЗЫКА”) 6
ЯНКА КУПАЛА “КУРГАН”. ТЭМА МАСТАКА І МАСТАЦТВА 8
ВАСІЛЬ БЫКАЎ “НЕЗАГОЙНАЯ РАНА” 10
ЗМІТРОК БДУЛЯ “НА КАЛЯДЫ К СЫНУ” 12
ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА 14
ЗАКЛЮЧЭННЕ 16
СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ 17

# ПРАДМОВА

> Скажы мне, я забуду.
> Пакажы мне, я магу запомніць.
> Дазволь мне зрабіць гэта, і гэта стане маім назаўжды.
> (Кітайская прыказка)

Слова «кросенс» азначае «скрыжаванне сэнсаў» і гэты метад распрацаваны Сяргеем Фядзіным – пісьменнікам, педагогам, матэматыкам і Уладзімірам Бусленкам – доктарам тэхнічных навук, мастаком і філосафам.

Дадзены метад упершыню быў апублікаваны ў 2002 годзе ў часопісе “Навука і жыццё”. Кросэнс уяўляе сабой стандартнае поле з дзевяці квадрацікаў, у якіх змешчаны малюнкі.

Задача кросенса – скласці апавяданне, асацыятыўны ланцужок, пасродкам узаемасувязі малюнкаў. Дзевяць малюнкаў расстаўлены такім чынам, што кожны малюнак мае сувязь з папярэдняй і наступнай, а цэнтральная аб'ядноўвае па сэнсе адразу некалькі. Сувязі могуць быць як павярхоўнымі, так і глыбіннымі, але ў любым выпадку гэтае выдатнае практыкаванне для развіцця лагічнага і творчага мыслення.

Чытаць кросенс трэба зверху ўніз і злева направа, далей рухацца толькі наперад і заканчваць на цэнтральным 9 квадраце, такім чынам атрымліваецца ланцужок загорнуты «слімаком». Пачаць можна як першай, так і з любой вядомай карцінкі. Цэнтральным з’яўляецца квадрат з нумарам 9. Па жаданні аўтара, ён можа быць звязаны па сэнсе з усімі выявамі выявамі ў кросенсе.

Працаваць з кросэнсам лепш у мікрагрупе ці парах. Дзейнасць настаўнікі тут – гэта арганізацыя сумеснага дзеяння навучэнцаў. Дзеці дапамагаюць адзін аднаму, ажыццяўляюць узаемакантроль, узаемадапамогу. У выніку фармуюцца рэгулятыўныя і камунікатыўныя ўменні вучняў.

Ужываць кросенс можна на любым прадмеце і ў любым класе.

Выкарыстанне такога метаду добра пры вывучэнні новага матэрыялу, вывядзенне тэмы ўрока, усталёўка праблемнай сітуацыі або

пры замацаванні і абагульненні вывучанага матэрыялу. Гэтак жа можна выкарыстоўваць кросенс у якасці хатняга задання.

Алгарытм складання кросенса:

1) вызначыць тэматыку, агульную ідэю;
2) пошук і падбор малюнкаў, якія ілюструюць элементы;
3) вылучыць 9 элементаў - малюнкаў, якія маюць дачыненне да ідэі, тэмы;
4) знайсці сувязь паміж элементамі, вызначыць паслядоўнасць;
5) сканцэнтраваць сэнс у адным элеменце (9 - ы квадрат);
6) вылучыць адметныя рысы, асаблівасці кожнага элемента.




Прымяненне кросэнса на ўроку разнастайнае: выдатна выступае як форма нетрадыцыйнай праверкі ведаў па прадмеце; можна выкарыстоўваць пры фармулёўцы тэмы і мэты ўрока; вызначэння тэмы ўрока, пры вывучэнні новага матэрыялу, у якасці пастаноўкі праблемнай сітуацыі, пры замацаванні і абагульненні вывучанага матэрыялу; пры падвядзенні вынікаў работы на ўроку, можна прапанаваць як рэфлексію, а таксама ў якасці творчага дамашняга задання (на выбар вучняў).

Кросэнс – гэта добры спосаб паглыбіць разуменне ўжо вывучанага школьнага паняцця (з’явы, тэмы); гэта магчымасць паказаць неардынарнае практычнае прымяненне ведаў і сувязь вывучанага з жыццём; гэта магчымасць усталяваць метапрадметныя сувязі з іншымі дысцыплінамі.

Такім чынам, кросэнс павышае ініцыятыўнасць, крэатыўнасць і развівае ўяўленне ў навучэнцаў. Таксама дадзены метад выконвае выхаваўчую функцыю. Ён можа стаць спосабам арганізацыі калектыўнай творчай справы па стварэнні інтэлектуальнай гульні, насценгазеты, паштовак да дня нараджэння аднакласнікаў.

Праца з кросенсам спрыяе развіццю камунікатыўных і рэгулятыўных уменняў, навыкаў працы з інфармацыяй.

Разглядзім стварэнне маўленчых сітуацый, якія стымулююць развіццё гаворкі школьнікаў на дзейнаснай аснове, на прыкладзе прымянення кросэнса пры правядзенні ўрока беларускай літаратуры ў VII класе.

## ЯКУБ КОЛАС. “У ЯГО БЫЎ СВЕТ ЦІКАВЫ…” (УРЫВАК З ПАЭМЫ “СЫМОН-МУЗЫКА”)




**Першы ўрок.** Знаёмства з творам

*Чытаем па гарынзаталі*: твор расказвае пра таленавітых людзей, якія выдзяляюцца сярод іншых, з’яўляюцца “белай варонай”; часта любяць бываць на ўлоні прыроды, думаюць, фантазіруюць; ім здаецца, што яны

разумеюць прыроду, такія людзі становяцца знакамітымі музыкамі, мастакамі, паэтамі; аўтар гэтага твора знакаміты чалавек ў Беларусі, які вельмі любіў сваю малую радзіму і шмат твораў прысвяціў ёй.
*Чытаем па вертыкалі*: чалавек вельмі шмат думае, прыкмячае незвычайнае ў звычайным, будзённым; душа спявае, калі чалавек зліваецца з прыродай; яна дапамагае гэтаму чалавеку раскрыцца праз пэўны від мастацтва; і як вынік, пра яго і яго творчасць дазнаюцца ўсе.
*Пра якога аўтара і пра які яго твор ідзе размова?*

**ЯНКА КУПАЛА “КУРГАН”. ТЭМА МАСТАКА І МАСТАЦТВА**



Праца з тэкстам паэмы

*Чытаем па гарынзаталі*: знаёмства з месцам, часам дзеяння; дуб, які сімвалізуе моц, сілу, мудрасць і кантраст – белы хорам, які стаіць на крутой гары і недаступны; давіць на людзей сваёй велiччу і гразой, холадам вее ад яго сцен; а зусім недалёка ад хорама суладдзе ў прыродзе, мір і спакой; у прыродзе пануе гармонія, чалавек адчувае сябе часцінкай гэтай гармоніі; князь аддае сваю дачку замуж і запрашае на вяселле знакамітага гусляра, каб той пазабавіў гасцей князя і праславіў бы гаспадара замка, прапануе дукаты; але сапраўднае мастацтва непадкупнае.

*Чытаем па вертыкалі:* у адным месцы сышліся сіла багацтва і сіла мастацтва; што пераможа: золата, улада, сіла або прыгажосць, чыстая

душа, каханне, прыгажосць, свет прыроды, набліжаны да чалавека, гукі і фарбы; не ўсё мераецца грашыма; сапраўднае мастацтва “арлам” і “зорам” толькі роўна, яно бясконцае; яно ўзнімае чалавека да нябёс, як магутны дуб, які цягнецца сваёй вяршыняй у неба; і самае галоўнае – сапраўднае багацце не мае кошту.

Закончыць разважанне хочацца словамі Міколы Гусоўскага:” Я прысягаюся: скрозь, да апошняга слова, пець толькі праўду…”

# ВАСІЛЬ БЫКАЎ “НЕЗАГОЙНАЯ РАНА”




Вобраз маці

*Чытаем па гарынзаталі*: шэрае асенняе неба, зацягнутае хмарамі, на двары стаіць старая жанчына і ўвесь час думае пра свайго сына Васілька, выцірае ражком хусткі вочы, сячэ жардіны; старая, з выцвілымі вачыма; успамінае свайго Васілька; шаснаццаць гадоў прайшло з той пары, калі ён адправіўся на вайну з ворагам; сэрца маці не перастае балець ад гора, не ведаючы, што стала з яе сынам; увесь час вочы старой звернуты на дарогу ў чаканні сустрэчы; глядзяць то з надзеяй, то з тугой.

*Чытаем па вертыкалі:* вайна не вярнула Тэклі сына, маці толькі атрымала трохкутнік, у якім гаварылася, што яе сына сярод загінуўшых і прапаўшых без вестак няма; для маці гэта надзея, гэта кожны дзень

чакання; сэрца маці яшчэ жывое, таму што ёсць надзея; дарога – гэта яшчэ адно тое, што звязвае яе з сынам; Тэкля адпраўляецца па дарозе на сустрэчу з сынам, але знаходзіць… абеліск у лесе; на ім спіс салдат, якія ў гэтай мясцовасці загінулі і заканчваецца гэты спіс словам “іншыя”; боль, нямы крык маці: “Сынок, дзе ты?”. Шаснаццаць гадоў у сэрцы восень…

# ЗМІТРОК БДУЛЯ “НА КАЛЯДЫ К СЫНУ”



*Ідэя кросанса* – разбітае матчына сэрца.

*Чытаем па гарызанталі:* Тэклю Цыпрук называе авечкай, бо ён раней за жонку бачыць, што панская ласка змяніла іх сына. Менавіта на Каляды Тэкля адпраўляецца да сына ў горад, бо на гэтае сямейнае свята яна востра адчувае сваю адзіноту, якая разбівае ёй сэрца. Да сына, а не атрымаць матэрыяльную дапамогу ідзе Тэкля, бо для падтрымання жыцця ёй хопіць і сухой скарынкі хлеба. Тэкля ідзе за чалавечым цяплом, любоўю сына, якія не купіш за грошы. Лаўрук не здольны даць гэтага цяпла, бо лічыць, што грашыма можна замяніць усё ў жыцці.

*Чытаем па вертыкалі:* менавіта на Каляды Тэкля асабліва востра пачынае адчуваць, што засталася адна; Тэкля не хоча верыць Цыпруку, што яе малы сын ужо пачаў цурацца бацькоў, і ўвыніку атрымлівае разбітае сэрца і некалькі мокрых паперак; пану Шчубальскаму падабаецца прыгожы хлопчык Лаўрук, і бацькі аддаюць сына пану, бо

спадзяюцца, што яго жыццё будзе лепшым, чым у іх, калі кожны дзень трэба думаць пра скарынку хлеба як сродак выжывання.

*Чытаем па дыяганалі:* любімы сын разбівае сэрца Тэклі, "панскі" свет назаўсёды забірае Лаўрука з сям'і, Лаўрук становіцца багатым матэрыяльна, але губляе чалавечнасць, што разбівае сэрца Тэклі.

# ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА











***Тэма*:**Уладзімір Караткевіч і Беларусь

*Чытаем па гарызанталі:* нарадзіўся ў Оршы, аб’ездзіў Беларусь удоўж і упоперак; цікавіўся гісторыяй Бацькаўшчыны; з-пад пяра выходзяць творы на гістарычную тэму: “Паром на бурнай рацэ”, “Чорны замак Альшанскі”, “Дзікае паляванне караля Стаха”, якія дапамагаюць нам акунуцца ў мінулае нашай Беларусі і перажыць разам з імі ўсе прыгоды.

*Чытаем па вертыкалі:* захапляўся фальклорам; напісаў аповесць пра сяброўства хлопчыка і мядзведзя; пра паходжанне Беларусі напісаў казку “Лебядзіны скіт”; падчас вандровак занатоўваў усё, што бачыў

вакол сябе, запісваў усё, пра што расказвалі жыхары мястэчак і вёсак; аўтар запрашае маладога чытача ў падарожжа па Беларусі, спрабуе паказаць хараство роднай прыроды, прывіць любоў да роднае зямлі, зацікавіць гісторыяй беларускага народуў нарысе “Зямля пад белымі крыламі”

*Ключавое слова*: Уладзімір Караткевіч

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Хочацца адзначыць, што інавацыйныя формы работы ў школе не адмаўляюць традыцыйныя, а толькі ўдасканальваюць іх, дапаўняюць. Калі выкарыстоўваеш у сваёй працы нешта новае, цікавае - захапляешся сам, а адпаведна і захапляеш дзяцей, а калі дадзеная дзейнасць прыносіць вынік - гэта цікава і займальна ўдвая.

Як бачым, кросэнс спрыяе развіццю лагічнага, вобразнага і асацыятыўнага мыслення, уяўлення; спрыяе праяве нестандартнага мыслення і крэатыўнасці; развівае здольнасць самавыяўлення. Пры разгадванні кросэнса развіваюцца камунікатыўныя і рэгулятыўныя ўменні; навык працы з інфармацыяй; павышаецца дапытлівасць, матывацыя да вывучэння прадмета. Нельга адмаўляць, што разам з лагічным мысленнем, развіваецца зрокавая памяць і звязнае маўленне.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Еўрапейская культура. “Мілавіца” – Венера беларускай каномікі. –Рэжым доступу: https://library.by/portalus/modules/beleconomics/readme.php?subaction=showfull&id=1465479672&archive=&start_from=&ucat=&. – Дата доступу: 25.01.2024.

2. Кроссенс технологии на уроках в начальной школе (мастер-класс) – Рэжым доступу: https://videouroki.net/razrabotki/krossens-tekhnologii-na-urokakh-v-nachalnoy-shkole-master-klass.html. – Дата доступу: 26.01.2024.

3. Усе малюнкі з сеткі інтэрнэта (Яндэкс малюнкі)